№ 2. Пятніца, 25 лістапада (12 ноября) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок 3 самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Хто ня прыслау яшчэ падпісных грошы за лістапад, таго просім не пазьніцца, каб ня было задзержкі у высылцы газэты.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

За астатні час увага ўсяго сьвета была на няскончанай яшчэ **Вашынгтонскай канфэрэнцыі**, якую склікала ў сябе Амерыка, каб разгледзіць пытаньне аб агульным зьмяншэньні вааружэньняў на моры і на сушы.

Няма што спадзявацца, каб з высокіх гутарак, якія былі на гэтай канфэрэнцыі, выйшла для сьвету якая-небудзь карысьць.

Наадварот, з засмучэньнем можна сказаць, што як гаагская прапазыцыя бышага расейскага цара Мікалая II аб агульным разаружэньні была прадвесьніцай Сусьветнай Вайны 1914—1920 г. г., так Вашынгтонская канфэрэнцыя вяшчуе цяпер вайну ў недалёкай будучыні між Амерыкай і Японіяй.

На супроць Вашынгтонскай канфэрэнцыі бальшавікі склікалі **канфэрэнцыю** азіяцкіх гаспадарстваў **у Іркуцку**, аб якой, на жаль, надта мала даходзіць вестак. Трэба думаць, што й на гэтай канфэрэнцыі былі ня меншыя, чым у Вашынгтоне, палітычныя неспадзяванкі.

З другіх важных палітычных зьявішчаў трэба адзначыць **Расейска-польскія адносіны**, якія й дагэтуль ні каліва не палепшалі і могуць спарадзіць у мірнага жыхара слушную няпеўнасьць у будучым дні.

Нічога добрага ня суляць і **Англіі** яе адносіны з **Ірляндыяй**. З таго боку можна чакаць нямалых навін, калі толькі заўсёдны практычны розум ангельскіх палітыкаў ня знойдзець новага шляху да паразуменьня з сінфэйнэрамі (ірляндзкімі незалежнікамі).

Паўстаньне на Украіне супроць Масквоўшчыны і бальшавікоў ізноў набрала моцы. Шмат дзе—крываьае змаганьне.

У зьвязку з гэтым паўстаньнем і адкрыцьцем у Букарэшце камуністычнай змовы, яшчэ болей папсаваліся адносіны **Румыніі** і Расеі. Бальшавікі паднімаюць пытаньне аб Бесарабіі, якую Румынія зусім няпраўна захапіла ў часе расейскай разрухі.

З бліжэйшых да нас палітычных спраў трэба адзначыць падгатавальную работу палякоў да скліканьня **Сойму у Вільні**. Дэкрэт аб Сойме спозьніўся дзеля таго, што ў Варшаўскім Сойме была вялікая спрэчка правейшых і лявейшых дэпутатаў з-за граніц, у якіх павінны адбыцца выбары.

Аб тым, што рабіць беларусам пры гэтых выбарах, калі яны будуць, Нацыянальны Камітэт у свой час паведаміць.

Унівэрсытэт у Менску.

У Менску адбылося урачыстае адкрыцьце дзяржаўнага Беларускага Унівэрсытэту з факультэтамі: мэдыцынскім, рабочым, грамадзкім, прыродазнаўчым, фізыка-матэматычным. Факультэты падзелены на сэкцыі: расейскую, беларускую і жыдоўскую. Запісалася 280 студэнтаў на мэдыцынскі і 800 на грамадзкі факультэт.

Што чуваць у сьвеце?

Амерыка і Расея.

Амерыканскі ўрад адказаў бальшавіком на ноту аб прызнаньні даўгоў, згаджаючыся пачаць перагаворы, але з варункам, што ўнутраная палітыка ў Расеі будзе зьменена і расейскім грамадзянам будуць забясьпечаны канстытуцыйныя свабоды. Амерыканцы вымагаюць скасаваньня чразвычаек і тэрору.

Чарнагорская рэспубліка.

Правадыр Чарнагорскіх паўстанцаў Марковіч абвесьціў незалежную Чарнагорскую рэспубліку.

Змаганьне з бальшавізмам у Польшчы.

Польскім міністрам унутраных спраў апрацован законапраект аб барацьбе з камунізмам.

Варшаўскія камуністы.

У зьвязку з чацьвёртымі ўгодкамі бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расеі, варшаўскія камуністы меліся зрабіць вялікую дэманстрацыю. Каля 60 асобаў было арыштована паліцыяй і дэфэнзывай.

Усерасейскі зьезд саветаў.

На 13 сьнежня назначан ўсерасейскі зьезд радаў.

Зямельныя непарадкі ў рэспубліцы Далёкага Усходу.

У рэспубліцы Далёкага Усходу вялікія аграрныя непарадкі. Рэгулярныя і японскія войскі робяць спатычкі з аддзеламі паўстанцаў. Чакаецца пераварот.

Змова ў Афінах.

З Афін паведамляюць, што там знойдзен загавор на жыцьцё караля Канстантына; арыштавана шмат асоб..

Падаткі.

Карэспандэнт „Валынскага Слова“ № 27 паведамляе з Варшавы:

У праекце міністра скарбу п. Міхальскага зямельныя падаткі з „Усходніх Крэсаў“ зьлічаюцца на тры з палавінаю міліярды марак. Разьлічка будзе рабіцца не на маргі, а на дзесяціны. Залежна ад вытворнасьці падаткі будуць хістацца ад 400 да 2.000 марак з дзесяціны.

Вашынгтонская канфэрэнцыя.

Старшынёю канфэрэнцыі выбралі міністра заграцічных спраў Паўночн.-Амэр. Злучан Штатаў Хюгса.

Хюгс сказаў нязвычайную прамову аб зьмяншэньні вааружэньняў. Ен запрапанаваў, каб Англія, Злучан. Штаты і Японія выкасавалі з свайго флоту 66 вялікіх ваенных суднаў,—Англія 19, Амэрыка 30 і Японія 17. Апроч таго, Хюгс агаласіў прапазыцыю Злучан. Штатаў прыняць узаемнае абавязаньне, зараз прыймаючае сілу, каб дзесяць гадоў не будаваць новых суднаў.—„Амэрыка, далаў Хюгс, будуець цяпер 15 новых ваенных суднаў. — Калі прапазыцыя будзе прынята, Амэрыка прыпыніць іх будаваньне“.

Прамова амэрыканскага міністра зрабіла ўражаньне разарванай бонбы. Другой такой бонбай для канфэрэнцыі была дэклярацыя амэрыканскага ўраду аб Далёкім Усходзе, якую агаласіў таксама Хюгс. Амэрыка бароніць тэрыторыяльную і эканамічную недатыкальнасьць Кітая і захаваньне за ім усіх прывілеяў, прызначаных незалежнаму гаспадарству, у тым ліку і сувярэннага права рабіць гандлёвыя ўмовы з кім хоця. Японія павінна адмовіцца ад кантроля над мангольскімі чыгункамі і ў самы карацейшы тэрмін вывесьці свае войскі з Сыбіру.

Яшчэ Хюгс казаў, што і Англія тое самае павінна зрабіць у Месапатаміі, бо і яе там палітыка пярэчыць правілу „адчыненых дзьвярэй“.

Вымагае Хюгс і адмены мандатаў усіх гаспадарстваў над быўшымі нямецкімі калёніямі.

Ангельскі дэлегат Бальфур згаджаўся з праектам Амэрыкі, але казаў, што пры марскім разаружэньні павінна быць узята пад увагу выключнае становішча Англіі, як астраўнога гаспадарства. Далей ён заявіў, што адначасова з разаружэньнем на моры павінна быць узьнята пытаньне аб разаружэньні на сушы.

Японскі дэлегат адмірал Като прызнаўся, што на яго думку канфэрэнцыя мае заданьнем перашкодзіць далейшаму ўзмацаваньню Японіі і што Японія згодзіцца на зьмяншэньне свае зброі, калі гэта ня будзе няпэўным для японскай імпэрыі.

Камісія, якой было даручана апрацаваць плян разаружэньня на моры, дайшла да той думкі, што згода аб зьмяншэньні вааружэньняў на моры Англіі, Амэрыкі і Японіі можа быць зроблена толькі пры ўмове, што і марскія сілы Францыі і Італіі будуць таксама зьменшаны.

Сьвяткаваньне угодак Слуцкага паустаньня

„Віленское Утро“ піша: „У суботу (19-XI) ў 7 гадзін вечара ў памяшчэньні Беларускага Музыкальна-Драматычнага Гуртка (Біскупская, 12) адбылося урачыстае паседжаньне Беларускага Нацыянальнага Камітэта.

На паседжаньні былі прадстаўнікі розных нацыянальнасьцяў і партый.

Ад Польскай Сацыялістычнай Партіі—п. п. Заштаўт і Годвад, ад ліцьвіноў—п.п. Аўгустайціс, Мічулайціс і Стадзевіч, ад яўрэяў— доктар Шабад.

Паседжаньне было адчынена ўступнай прамоваю Старшыні Белар. Нац. Каміт. п. Ярэміча, паказаўшага на тое, што гэты дзень ёсьць знамянальным для кожнага беларуса, бо ў гэты дзень беларускі народ Слуцкага павету паўстаў супроць уціскаіньнікаў.

Вялікі рэфэрат аб ходзе паўстаньня прачытаў быўшы старшыня Слуцкай Беларукай Рады п. Пракулевіч.

Пасьля гэтага з вялікай прамовою на беларускай мове высгупіў ксёндз Станкевіч.

Прадстаўнікі Польск. Сац. Парт. (P. P. S.) гаварылі папольску. П. Аўгустайціс гаварыў палітоўску. Д-р Шабад пачаў прамову на яўрэйскай мове, але зараз перайшоў на расейскую мову, як зразумелую для ўсіх прысутных.

Затым адбыўся дывэртысмэнт. Чыталіся беларускія вершы паэтаў Купалы і Багдановіча; хор пяяў беларускі гімн.

Закончылася урачыстасьць агульнай вячэраю, у часе якой казалі прамовы п.п. Луцкевіч, Заштаўт і інш.

Памяшчэньне Гуртка было дэкарыравана і прыбрана беларускімі сьцягамі, а таксама плакатамі з нацыянальна-беларускімі клічамі“.

„Крыніца“.

Бюро друку Часовай Урадуючай Камісіі паведамляе, что рашэньнем Адміністрацыйнага Аддзела 14 лістапада выдавец зборніка артыкулаў „Funken“ Нохім Струнскі пакаран штрафам на 75.000 марак, а *рэдактар „Krynicy“ Валадзіслау Знамяроускі пастановаю ад* 11 *лістапада на* 10.000 *марак*: Першы за парушэньне § 17 дэкрэту ад 25 студня 1921 г. № 80, *другі за парушэньне* § 10 *таго-же дэкрэту*.

Зьняпрауджаньне Бюро друку Час. Урадуючай Камісіі паведамляе нас: Газэта „Krynica“ ані ж ня была зачынена з распараджэньня Дырэктара Дэпартамэнта Унутраных Спраў. Рэдактар Грыневіч сам зрокся сваей канцэсіі. Дзеля таго „Krynica“ перестала выхадзіць Новая канцэсія на „Krynicu“ нікому дагэтуль ня дадзена Дырэктарам Унутраных Спраў

На права быць рэдактарам і выдауцом „Крыніцы“ падау заяву, як мы чулі, грам. Рагач.

Савецкая Беларусь

Падвоз дроў.

У Савецкай Беларусі абвешчан дрывяны трохнядзельнік.

За тры тыдні сяляне павінны падвезьці на чыгункі і фабрыкі патрэбную колькасьць дроў.

Для сялян — падводчыкаў адпушчана 25.000 пудоў збожжа і 640.456.000 рублёў.

Цэны за падвоз аднага сажнёвага куба сухіх дроў гэткія:

1 вярста — 2.000 рублёў і 12 хунтаў мукі; 2 вярсты — 3000 р. і 20 х. мукі; 3 вярсты — 4.000 і 28 х. мукі; 10 вёрст — 10.450 р. і 68 х. мукі; 15 вёрст — 14.400 р. і 88 х. мукі г. д. („За Свободу“)

Забарона платы за прававучэньня.

Москва, 31—X (но) Радаю народных камісараў Беларусі станоўча забаронена уводзіць плату за права вучэньня і адчыняць платныя школы. Школам дазволена адчыніць уласныя вытворчыя прадпрыемствы, сельска-гаспадарчыя фермы, рабіць умовы з кааперативамі і супалкамі. Уводзіцца натуральнае самаабложэньне жыхараў, каб даваць харчавыя пвадукты працаўнікам асьветы і забясьпечыць школы апалам. („Путь“).

Беларусы ў Латвіі.

Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Прасьветы.

РЫГА. 4. XI. 21. (Ад уласнага карэспандэнта).

Беларускае Культурна - Прасьветнае Т-ва „Бацькаўшчына“ ў Латгаліі, распачаўшае сваю працу ў красавіку гетага году, здолела за мінулае лета правесьці шмат культурнай працы.

Праведзены Беларускія вучыцельскія курсы ў Дзьвінску і сарганізавана пры Таварыстве беларуская трупа, зроблена некалькі сьпектакляў і вечарынак, наладжана утварэньне ў Латгаліі беларускія школы, утвораныя школкі задаволены патрэбным лікам падручнікаў і кніжак для чытаньня і, нарэшце, заходамі Таварыства прад Урадам Латвіі і па згодзе з ім, — утворан Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Прасьветы Латвіі.

Пастанова аб адчыненьні Беларускага Аддзелу зроблена Урадам Латвіі 13. VIII. 21., а затым 18. IX. 21 зацьверджаны на пасадзе кіраўніка Аддзелу гр. Сяргей Пятровіч Сахараў, кандыдатура якога на гэту пасаду была высунута Т-вам „Бацькаўшчына“.

Справа адчыненьня Беларускага Аддзелу была вельмі прыхільна спаткана ўсімі фракцыямі Устаноўчага Сойму Латвіі — апрача фракцыі Расейскай Меншасьці, якая афіцыяльна і на паперы адмовілася ад падтрыманьня беларускіх інтарэсаў,—асабліва-ж прыхільна яна была спаткана групай Райніса, вялікага латышскага паэты, які сваім асабістым удзелам і заходамі прад Урадам шмат дапамог Таварыству ў працы фармальнага правядзеньня справы Аддзелу.

Да часу адчыненьня Аддзелу, які ўжо прыступіў да працы, Т-ва «Бацькаўшчына» здалела адчыніць больш 20-ці школак, з якіх у адным толькі Дзьвінскім павеце адчынена 17 беларускіх школак.

Трэба спадзявацца, што з адчыненьнем Беларускага Аддзелу лік беларускіх школак шпарка будзе расьці.

Кіраўнік Аддзелу гр. С. П. Сахараў — стары педагог, які пачаў сваю працу з народнай школкі і пабываў па парадку: ў вышэйшай пачатковай школе, ў сэмінарыі (пасьля сканчэньня ўнівэрсытэту, куды ён пастуціў пасьля некалькіх гадоў вучыцельства ў пачатковай школе), на пасадзе Інспэктара Пачатковых школак і, нарэшце, на пасадзе Дырэктара Люцынскай Гімназіі.

Бліжэйшы яго памошнік, гр. Шчорс, таксама былы інспэктар пачатковых школак.

Пры Аддзеле робіцца, з прадстаўнікоў Беларускага вучыцельскага хаўрусу і з прадстаўнікоў Т-ва «Бацькаўшчына» — Беларуская Рада Аддзелу, якой надаецца характар інстытуцыі пастанаўляючай. Старшынёй Рады Аддзелу намячаецца гр. Канстантын Езавітаў, —Старшыня Цэнтральнага Праўленьня і Рыжскага Аддзелу Т-ва „Бацькаўшчына“.

Кастусёнак.

Дапамога Беларускаму Тэатру у Латгаліі

ДЗЬВІНСК. 5. XI. 21. (Ад уласнага карэспан.

Беларускае Культурна - Прасьветнае Т-ва „Бацькаўшчына“ зьвярнулася да Міністра Прасьветы з просьбай адпусьціць Беларускаму Тэатру Т-ва „Бацькаўшчыны“ ў Дзьвінску 50.000 латвійскіх рублёў аднаразовай дапамогі.

Міністар Просьбу Таварыства абяцаў задаволіць і пераносіць справу на разгляд Рады Міністраў Латвіі.

2-я Беларускія Вучыцельскія Курсы у Латвіі.

РЫГА. 5. XI. 21. (Ад уласнага карэспандэнта)

Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Прасьветы Латвіі атрымаў згоду Рады Міністраў на ўтварэньне Гадавых Беларускіх Вучыцельскіх Курсаў.

На курсы, да 1. IV. 22, асыгнавана 63.000 латвійскіх рублёў. Пасьля 1. IV. 22. — будзе зроблена, ў залежнасьці ад патрэб і шырыні працы, яшчэ новае асыгнаваньне.

Літоўскае жыцьце.

У нядзелю 13-га лістапада ў Віленскім Літоўскім Клюбе, у яго новым памяшчэньні па Біскупскай вул. 12, адбыўся першы ў бягучым сэзоне літоўскі вечар. Праграма складалася з дэклямацый, харавога і сольнага пяяньня і музыкі 9-гадовага С. Гэльмана. Споўнілі праграму вучні старшых клясаў 1-й Літоўскай Віленскай Гімназіі Трэба адзначыць добрае пяяньне народных літоўскіх песьняў, надта паэтычных і арыгінальных. Публікі было поўна.

Рэдактарка тыднёвіка „Vilniaus Garsas“ Мар'я Марцішаўская пакарана Дырэктарам Дэпартамэнту Унутраных Спраў Сяпкевічам на 50 тыс. штрафу за карэспандэнцыю з Дукшт і Лынкмян у № 44 (75). („Now. Wil.“)

Літоўска-амерыканскае гандлёвае таварыства, маючае вялізныя капіталы, пачало будаваць літоўскі порт, дзе ўпадае рака Сьвента. У гэты порт будуць захадзіць судны ў 1.000 тон. (Руспрэс).

Экспортныя аперацыі з літоўскім лёнам усё павялічываюцца і шырэюць. Зроблена шмат умоў з амерыканскімі і ангельскімі фірмамі. (Руспрэс).

Жыдоускае жыцьце.

У Вільні памёр вядомы выдавец кнігі гаспадар вялікай бібліатэкі і кнігарні І. А. Сыркін.

У рыскай газэце „Дэр Фольк“ навочны сьведка апісуець пагромы ў Беларусі. Ен кажа, што пагромы робяцца ня тутэйшымі сялянамі, а бадзяшчымі бандамі, якімі кіруець тайная арганізацыя

Смаленская жыдоўская сэкцыя камуністычнай партыі забараніла выкладаць навукі ў тутэйшай жыдоўскай гімназіі пажыдоўску. („Е. Т.“).

У Літоўскай Рэспубліцы дазволена падаваць тэлеграмы на жыдоўскай мове; літэры павінны быць лацінскія („Е. Т.“).

Вядомы віленскі жыдоўскі дзеяч і старшыня абшчыны д-р Выгодзкі сказаў у гутарцы з супрацоўнікам польскага бюро друку „Е. Е.“, што ён—за Вялікую Літву. „Вялікая Літва і этнографічная аўтаномія для ліцьвіноў, палякоў і беларусаў, а для жыдоў—аўтаномія персанальная“—гэткая праграма д-ра Выгодзкага, якую мае, на яго думку, і большасьць жыдоўскіх жыхароў.

Перад скліканьнем Сойму.

16 лістапада Варшаўскі Сойм прыняў закон аб скліканьні ў Вільні Сойму з прадстаўнікоў Віленскай зямлі і аб ўключэньні ў тэрыторыю так званай „Сярэдняй Літвы“ двух паветаў Лідзкага і Браслаўскага.

20 лістапада Начальнік Польскай Дзяржавы Я. Пілсудзкі сустрэнуўся ў Лідзе з ген. Жэлігоўскім і панам Аляксандрам Мэйштовічам.

21 лістапада ген. Жэлігоўскі падпісаў два дэкрэты: 1-ы — аб назначэньні п. А. Мэйштовіча старшынёю Урадуючай Камісіі Сярэдняй Літвы і 2-гі — аб звальненьні ген. Макжэцкага з пасады старшыні Урадуючай Камісіі і назначэньні яго віцэ старшынёю гэтай Камісіі.

Газэты, далей, паведамляюць аб тым, што ў суботу, 26 лістапада, зьявіцца за подпісам ген. Жэлігоўскага дэкрэт аб скліканьні Сойму ў Вільні на дзень 6 студня (январа) 1922 г. Пасьля апублікаваньня гэтага дэкрэту ген. Жэлігоўскі выедзе з Вільні, а справу выбараў правядзе п. А. Мэйштовіч.

Так стаіць цяпер справа скліканьня Віленскага Сойму.

Што можна сказаць новага аб Віленскім Сойме? Амаль нічога.

Дадатак да Сярэдняй Літвы двух паветаў: Лідзкага і Браслаўскага мала што зьмяняе ў пытаньні аб нашых адносінах да штучна выкраяных выбарных тэрыторыяў.

Чаму ў Сярэднюю Літву ўключаны Браслаўскі і Лідзкі паветы, а іншыя суседнія беларускія паветы: Дзісьненскі, Вялейскі, Валожынскі, Наваградзкі, Баранавіцкі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Горадзенскі ня ўключаны? Ці-ж не адзін і той самы народ пражывае ва ўсіх уключаных і ня ўключаных у Сярэднюю Літву паветах—народ беларускі? Штучнасьць выбарнай тэрыторыі ў Віленскі Сойм, так як і вынікі ад выбараў у гэты Сойм, для нас ясныя.

Карыснымі для беларусаў выбары ні у якім прырадку быць ня могуць. Спытаюцца: чаму? а таму галоўным чынам, што на абшарах Беларусі, адыйшоўшай пад Польшчу пасьля Рыскага міру і „віленскай выправы“, усё беларускае старанна ў апошнія часы нішчылася, а польскае ўмацоўвалася. Асабліва гэта трэба сказаць пра той пас, на якім замераны цяпер выбары ў Віленскі Сойм — па лініі Ліда—Вільня—Дзьвінск, пас—найбольш спольшчаны.

Потым *Якая есьць надзея на свабодную агітацыю?* Ці будзе яна дапушчана? Здаецца нам, што навет калі-б і быў аддадзены самы строгі загад згары аб свабодзе агітацыі, то на мясцох гэтая „свабода“ пры цяперашніх варунках ня мела-б месца.

Далей. Які астаецца тэрмін на агітацыю? Ад 26 лістапада да 6 студня—сорак дзён

Паспрабуйце пры такой скорасьці выбараў у Сойм арганізавацца, скласьці выбарныя сьпісы, пачаць агітацыю і г. д.

Нам здаецца, што *пры найлепшым жаданьні пайсьці на выбары, трудна каб хто-небудзь з уціснутых „меншасьцяў“ мог адважыцца на.... правал.*

Але, вось пачакаем дэкрэту аб выбарах. Быць можа акажацца, што справа аб выбарах у Віленскі Сойм стаіць ня так, як пакуль што гавораць.

Быць можа сярод беларусаў і нойдуцца групы, якія, ня гледзячы на дрэнныя варункі, усё-ж такі пойдуць на выбары.

В.

Наша доля.

Няшчасная доля сельска-гаспадарскіх работнікаў з прадназначаных пад каланізацыю польскімі салдатамі фальваркаў павінна астанавіць на сабе ўвагу сьвядомага грамадзянства. Салдаты-каланісты, занятыя ў Вялейскім павеце фальваркі Ляспаль, Краснае, Варадзіна, Талуйзь, Казлеўшчыну, Даўгінава, Стасіна, Стажынку і Лаўцэвічы, першым чынам стараюцца якнайхутчэй выселіць жывучых там даўнейшых панскіх работнікаў. Можа праз гэтую зіму некаторым з іх яшчэ ўдасцца пратрымацца на старых мясцох, але на вясну пека ькі дзесяткаў сямей напэўна будзе выкінута на вуліцу.

Тымчасам, большая часьць гэтых людзей — старыя работнікі ў фальварках. Лепшую часьць свайго жыцьця і здароўя яны аддалі для працы на паноў. Нямала крывавага поту іхнага і іхных жонак і дзяцей праліта на зямлі, з каторай іх цяпер зганяюць, як сабаку, заляцеўшага на чужы панадворак. У часе наезду бальшавікоў, калі ўсе паны і эканомы былі разьляцеўшыся няведама куды, панскія дворы, з каторых цяпер выганяюць работнікаў, асталіся толькі дзякуючы іхнім просьбам не паліць прыгулку бедных людзей.

Зьвярталіся работнікі да прадстаўніка польскага ўраду, Вялейскага Земскага Камісара з просьбамі аб астаўленьні часткі фальваркаў для надзяленьня іх зямлёй і пазваленьня жыць у двары пакуль ня знойдуць сабе новых кватэраў, але той кажа, што аб іх долі павінен рупіцца даўнейшы пан, пані ды яшчэ выгаварывае, чаму яны ўпіраюцца выяжджаць з фальваркаў.

Такія адносіны да дворскіх работнікаў ня могуць быць дапусьцімы з боку ўраду дэмакратычнага гаспадарства. Трэба быць наіўным дзіцяцей, каб спадзявацца якой-колечы дапамогі ад паноў, раз само гаспадарства ўмывае рукі.

Справядлівасьць вымагае, каб дворскія работнікі з прадназначаных пад ваенную каланізацыю фальваркаў былі надзелены зямлёй за выплату ў разсрочку і прытым без адкладываньня гэтай справы на доўгі час, але разам з каланістамі пры развёрстцы фальварку.

Людзі, аб долі каторых тут гаворыцца, з малых дзён сваіх працавалі на гаспадарцы, большая часьць іх мае сваіх кароў і коні і за такіх новых гаспадароў ня прыдзецца, як за другіх, баяцца, што спустуюць дадзеную ім зямлю.

Антон Губскі.

Старая прыказка на новы лад.

Спорка, якая ўзьнялася паміж начальнікам Польскае дзяржавы і ўсей правай палавіной варшаўскага Сойму, мае для Беларусаў, аб зямлю каторых яна йдзе, чыста тэорэтычнае значэньне. Запраўды, ўнікнем у істоту споркі і паглядзім, аб што йдзе спрэчка.

Адны хочуць, каб у віленскі сойм дэпутатаў выбіралі 4 паветы Віленшчыны; другія — каб да цяперашняга абшару „Сярэдняе Літвы“ былі далучаны йшчэ і паветы Лідзкі, Валожынскі і Браслаўскі, ды частка Горадзенскага (па Нёман бяз места Горадні), каторыя нейкім незразумелым спосабам былі ад яе адрэзаны. Чым кіруецца ад а і другая старана—нам у гэты момэнт ня цікава. Затое вельмі цікава другое, а ўласьціва вось што.

Ня гледзячы на тое, што польскія статыстыкі у абрэзанай „Сярэдняй Літве“ знайшлі ажно 66% палякоў (!!!); а ў пашыранай крыху менш—63% (!!), усё ж ніхто навет з палякоў ня можа сур'ёзна казаць аб тым, быццам Віленшчына запраўды нічым ня розьніцца ад Польшчы. Факт астаецца фактам: што бы ні пісалі на паперы казённыя статыстыкі, Віленшчына гэтак далёка ад Польшчы, што зусім выразна пачалі цяпер казаць (праўда, *толькі* цяпер — пасьля ухвалы Лігі Народаў!) аб аўтаноміі для яе. Але, калі для прызнанай за „ісконі польскій край“ Віленшчыны патрэбна аўтаномія, дык ясна, што другая палова Заходняе Беларусі (Горадзеншчына, часьць Меншчыны і частка Віленшчыны), якая адыйшла да Польшчы, як падарунак ад Савецкае Расеі, паграбуе ўжо не аўтаноміі, а хіба нечага большага: там жа 66% палякоў нават казённыя статыстыкі не здалелі налічыць!

Гэта дужа добра разумеюць кіраўнікі польскае палітыкі і дзеля гэтага-то яны і не заікаюцца аб сойме для гэнае другое паловы Заходняе Беларусі. Яны ведаюць, што там цяжэй было-бы правясьці іхныя пляны: там пераважываюць праваслаўныя беларусы, і іх нельга так ачмуціць, як чмуцяць нашых каталікоў у Віленшчыне ксяндзы-эндэкі. Вось, ведаючы гэта, яны і падзялілі суцэльны абшар Заходняе Беларусі, які адыйшоў ад Расеі на дзьве паловы: долю аднэй мае вырашыць сойм у Вільні, дзе эндэкі ўжо „*забясьпечылі*“ сабе перавагу: долю другой—варшаўскі сойм, дзе пануе поўная *згода ўсіх партый* у справе „наварачываньня“ беларусаў на польшчыну...

Старую лацінскую прыказку ,Divide et impera' (дзялі і пануй) якая мае на думцы ўзьніманьне між людзьмі і народамі сваркі і карыстацца імі дзеля панаваньня над пасваранымі, польскія палітыкі крыху пашырылі, ўлажыўшы ў яе новы зьмест: дзялі зямлю Беларускую на часткі, і кожную частку асобна лягчэй будзе апанаваць...

I. М.

Палітыка у кааперацыі.

На практыцы, на сваей уласнай скуры мы за час доўгае маскоўскае няволі добра пазналі, што значыць „казённая апека“ чужацкае ўлады над заняволеным народам. „Апека“ маскоўскага ўраду над эканамічным жыцьцём нашае Бацькаўшчыны—гэта быў адзін гвалт, адзін зьдзек, адно разьбіваньне эканамічнае моцы народу, эканамічнае руйнаваньне краю —дзеля ўзьвялічэньня нашым коштам Цэнтральнае Расеі.

Такую ж палітыку вялі ў нас і ўсе акупанты, якія ў працягу некалькіх гадоў зьмянялі адны адных.

Цяпер наш народ ужо дайшоў да таго разуменьня, што на ласцы чужынцаў нічога ня збудуеш. І народ наш верыць толькі ў свае сілы, толькі сваімі сіламі хоча тварыць свой матар'яльны дабрабыт.

Як доказ гэтаму—наша *самапомач*, наша *кааперацыя*.

На маленечкім абшары „Сярэдняе Літвы“ беларускае сялянства заснавала сотні кааператываў, якія, у свой чарод, заснавалі моцны саюз з цэнтрам у Вільні—„Віленскі Саюз Кааператываў“. Да саюзу далучылася ўжо больш за сто кааператываў, параскіданых па краю; другія сто бяруць ад Саюзу тавары. Гэтак у Саюзе аб'яднаны каля 75.000 сем'яў. Ад яго залежны і Наваградзкі Саюз з сваімі 30-ма кааператывамі. У паветах Віленшчыны існуе шэсьць аддзелаў Саюзу.

Віленскі саюз кааператываў, дзякуючы працы творчых элемэнтаў нашага народу, стаўся сур'ёзнай краёвай арганізацыяй, якая далей арганізуе нашы эканамічныя сілы. Саюз дайшоў моцы і значэньня ў краю не за тым, што камусь-то збоку гэтага хацелася: ён вырас з істотнай патрэбы народных масаў бяз ніякае падмогі ці падтрыманьня ўлады. І ў гэтым—яго сіла: ласка чужацкае ўлады зьменная, патрэба народу—нязьменна.

Зусім натуральна, што па свайму нацыянальнаму складу Саюз павінен быў адбіваць нацыянальны склад аб'яднаных кааператываў. А як сялянскія масы ў нас беларускія, дык і большасьць сяброў Ураду Саюзу станавілі беларусы-ж (пры адным паляку і адным ліцьвіне). Урад быў абабраны агульным зьездам паўнамоцнікаў ад кааператываў. Вынік выбараў дае ясны доказ, якую праўду маюць усе тыя „робленыя“ статыстыкі, каторыя імкнуцца зусім зьвясьці са сьвету беларусаў! Выбары гэныя—найлепшае выяўленьне волі тутэйшага сялянства, і перад апошняй трэба толькі схіліць галаву.

Але як раз гэта вызвала цэлую буру ў польскім эндэцкім абозе. Такога яркага, відавочнага выяўленьня істотнага аблічча краю не маглі сьцярпець тыя, для каго важна ня тое, каб край эканамічна арганізаваўся, каб сваймі сіламі тварыў свой дабрабыт, а важна правядзеньне іх дзікіх, шовіністычных мэтаў. І вось проці Віленскага Саюзу Кааператываў пачаўся арганізаваны паход польскага нацыяналізму.

Перш за ўсё—у тыдзень пасьля выбараў Ураду— на саюз налажылі міліён з лішкам марак падатку. Гэты падатак налажаны няправільна, бо саюз ня меў ніякага зыску, а меў дэфіцыт. З яўнай мэтай урадоўцы скарбу ўварваліся ў памяшчэньне саюзу, апячаталі кнігі і г. д.—Націск аднак, ня ўдаўся.

Дзеля канкурэнцыі з Саюзам, з урадовай падмогай быў заснаваны ў Вільні польскі Саюз Кааператываў з панам Турскім на чале. Сюды ўвайшлі такія кааперaтывы, якія працуюць ня дзеля ідэі самапомачы народу, а дзеля правядзеньня мэтаў польскага нацыяналізму і рэакцыі (Liha Robotnicza і др.) Ясна, што такая кааперацыя ня можа разьвівацца. І гэны новы Саюз ледзьве дыхае, ня гледзячы на тое, што ўлада Сярэдняе Літвы дае яму крэдыт на 70 міліёнаў марак. Тая ж улада дае вялікі крэдыт аляксюкоўскай „Самапомачы“, якая служыць тым-жа польскім палітычным мэтам; затое Віленскі Саюз Кааператываў ня толькі ня мае ніякае помачы, а ўсюды сустракае прашкоды з боку адміністрацыі.

Адначасна з гэтым „Страж Крэсовая“ і эндэкі павялі самую шырокую агітацыю проці В. С. К. і ў газэтах, і ў народзе. У газэтах друкуюцца ўсьцяж нягодныя даносы на Саюз, —ведама, не абапёртыя на фактах, якіх няма. Па вёсках сьпецыяльныя інструктары (пан Уступскі) стараюцца збудзіць у людзей няверу да Саюзу, адгаварываюць далучацца да Саюзу, а то і проста пагражаюць карамі. Гэта, аднак, не дае вынікаў.

Дык на сцэну выступае адміністрацыя. Павятовыя старасты з усіх сіл стараюцца закладаць на паветах свае саюзы і гэтак адрываць кааператывы ад Віленскага Саюзу Кааператываў. Але народ ужо ведае цану „казённае кааперацыі“ і на гэту падманку ня йдзе.

Цяпер пушчаны ў ход апошні спосаб: не ўдаецца разьбіць Саюз ударамі звонку, дык трэба ўзарваць яго знутра. Варшава падаслала свайго чалавека, выдатнага польскага кааператара, пана Вольскага, на якога і ўзлажылі выпаўненьне гэтае работы. Хаця кожнаму павінна было дзіўным здацца, чаго пан Вольскі прыехаў да нас з Польшчы,—Урад Саюзу, маючы на мэце не палітыку, а выключна эканамічную працу, ахвотна прыняў пана Вольскага за інструктара, як дазнанага сьпецыяліста, на асабліва выгодных варунках. І вось з таго часу пачынаецца падкопная работа проці Ураду Саюзу: бунтаваньне працаўнікоў Саюзу проці яго Ураду, вымаганьне дарогай пагрозаў злучэньня з польскім саюзам, вымаганьне зьмены статуту, сачэньне за кожным крокам Ураду, „падлаўліваньне“ кожнае памылкі, якая заўсёды магчыма ў такім вялікім дзеле, і выкарыстываньне гэтага ўсімі спосабамі дэмагогіі. Пускаюцца фальшывыя чуткі аб няістнуючых непарадках і навет злоўжываньнях Ураду. Урэшце, ўлада пачынае судовую справу проці Ураду Саюзу: ворагам Саюзу такі ўдалося на нейкай фармальнай няправільнасьці „падлавіць“ Урад.

Спадзяючыся сваей адстаўкай выратаваць Саюз, Урад ідзець на гэтую ўступку сваім ворагам. Нічога гэта не памагло, ня гледзячы, што ў новым Урадзе беларусы ў меншасьці, напады польскай прэсы, відаць інспіраваныя ўсё тымі-ж панамі Вольскімі, што дня робяцца гастрэйшымі. Чорныя газэты дамагаюцца рэпрэсій, рэпрэсій і яшчэ рэпрэсій. А самае сумнае, што ў ва ўсім гэтым „канцэрце“ выступ робяць тыя асобы, якія адважуюцца называць сябе польскімі „кааператарамі“.

Вось абраз барацьбы з адзінай на ўвесь край, запраўды народнай эканамічнай арганізацыяй — барацьбы за тое, што гэта арганізацыя, зложаная з пераважываючага тут беларускага насяленьня, адбівае ў сабе яго беларускасьць' Польскі ваяўнічы нацыяналізм які ўжо „расправіўся“ з Літвінамі, пачаў руйнаваць усе беларускія ўстановы, руйнаваць тое, чым жыве наш народ, руйнаваць асновы эканамічнага быту краю.—Зусім так сама, як рабіў стары маскоўскі ўрад.

І хоць той царскі ўрад даўно памёр, ідэі яго перажылі свайго творца...

І. Мялешка.

Дапамога беларускаму сялянству.

Яшчэ з самага пачатку вясны пашлі чуткі па вёсках, што ўлада польская паклапацілася аб абяздоленых вайной сялянах і прышлець збожжа для абсямяненьня іхніх, зруйнаваных вайной, палёў. Усе гэтыя „шчасьлівыя“, выгнаныя царскім бізуном з родных хатаў, пабадзяўшыся некалькі гадоў па чужых кутках расейскіх, вярнуліся цяпер на родныя палоскі. Але вядома, што на месцы тым знайшлі яны толькі кусты бярозак ды палыну. То нядзіва, што будучы ў такім горы, ня маючы, як кажуць, ні снасьціны, ні скаціны, аж заплакаў наш бяздольнік ад радасьці, пачуўшы, што й аб ім не забылася ўлада і не дапусьціць згінуць з голаду. Яшчэ больш абрадаваўся ён, калі дачуўся, што прышлюць збожжа на насеньне і такім гаротнікам будуць даваць дарма з тым варункам, каб у восень зжаўшы, вярнуць уладзе насеньня, з невялікім, ведама, процэнтам. Скуль узялася такая вестка, ніхто добра ня ведаў, але досыць таго, што нехта некаму ды негдзе казаў так. Скарэй за ўсё з таго, што сялянству так жадалася. Ды яно, па праўдзе сказаўшы, начай не магло й быць. Бо скуль-жа ўзяў-бы такі „гаспадар“ грошы, калі вярнуўся ён, як кажуць, толькі з душой. Ці прышлося потым каму дастаць збожжа на „аддачу“ ці не, але досыць таго, што збожжа было прывезена. У той час, як яшчэ рабілі сьпіскі, колькі каму патрэбна насеньня, збожжа перавозілі са станцыі Гародзькаў ды ў вёску Гародзькі і ссыпалі ў магазын, які нейкім дзівам уцалеў ад вайны. Гэтым збожжам распараджаўся referent rolny нейкі пан Галынскі. Гэты рэфэрэнт мусіць вельмі добра ведаў сваю службу, бо трэба было толькі дзівіцца, як ён скора разгружаў вагоны з збожжам, хаця праўду сказаўшы, бедная была тая скацінка, якая пападалася ў нарад, дзеля перавозкі збожжа і, нешчасьлівы быў той возьнік, які й сам надрываўся, цягаючы мяшкі з збожжам і мусіў надрываць сваю скацінку. Яшчэ цікавейшы быў сам пан Галынскі. Ён быў вельмі добры чалавек, меў гутаркі „як вады“ навет з работнікамі, але гэта было з ім толькі тагды, як абаб'еці каго. Ці гэта ў яго была прывычка такая, ці так хвароба якая, але абабіць каго яму трэба было абавязкова. Прычыны-ж яму, абабіць каго, ня доўга трэба было шукаць: ці мяшок хто не па яго ўзяў, ці не па яго высыпаў, вось і дастаў на „морду“ няпрыемнасьць. А здаралася, што й гэтага яму непатрэбавалася. Напрыклад, вязець адзін раз чалавек дровы. Праяжджае каля магазыну, у якім пан Галынскі ссыпаў збожжа. Пагода ў гэты дзень была вельмі гарачая, авадні канінку ядуць, калёсы скрыпяць, і наш возьнік не дачуў, як да яго з магазыну закрычэў рэфэрэнт. Магазын-жа стаіць крокаў 40 ад дарогі. Як га дагнаў рэфэрэнт возьніка, надаў яму ў „морду“ і памаленьку пайшоў сабе назад. Возьнік гэты быў з вёскі Гародзькаў. Быў і цяпер ёсьць старшынёй Гародзькаўскага Беларускага Кааператыва «Надзея». Як і ўсе сяляне вёскі Гародзькаў—беларусы, так і старшыня кааператыва грамадзянін А. Канапелька—беларус. Але ці гэта прыняты ад рукі Галынскага хрэст так моцна павярнуў старшыню ў бок расейшчыны, ці можа так якая цёмная сіла, але нешта нейкае ды ёсьць. Бо на сьцяне яго собскага дома, у якім мясьціцца і крама кааператыва, вісіць цяпер вывеска, напісаная папольску і пастара-расейску, чаму я, ведаючы Гародзькаўцаў, а так сама другіх вайшчыкаў-беларусаў, ніколі-б не паверыў, каб не здарылася мне быць у Гародзьках і самому відзець гэту нягодную вывеску. Вельмі шкада, што няма цяпер Галынскага, а можа й здарылася-б калі адхрысьціць старшыню „назад“.

Як было, то было, але збожжа і бульбы прыслалі множства, хаця яшчэ больш запісалася народу,—патрабуючых насеньня. Нягледзячы на тое, што пара сяўбы была на заходзе, збожжа яшчэ не выдавалася сялянству, бо трэ было чакаць „парадку“ пакуль сьпіскі зацьвердзіць староства павету, а можа й яшчэ хто іншы. Чакаць „парадку“ ведама, ня ўсім прышлося. Знайшліся й такія, якім і без „парадку“ выдалі збожжа. Але, ведама, такім шчасьлівым насеньня выдалі па крысе, бо й Гародзькаўскаму пану выдалі першы раз толькі 500 пудзікаў аўсу, а па колькі пудзікаў браў усяго іншага, добра не ведаю, толькі дагадваюся, што можа трошкі й больш, як аўсу. Але дзякуй Богу й за гэта. Бо калі дастаў пан, дык так, ці гэтак, дастаў ад яго і наш брат: пlivораваў пану тры веснавых дзянёчкі і маеш за гэта пуд аўсу. А што значыцца нашаму брату-селяніну паворваць тры дні? Не прывыкаць-жа яму да гэтага. Ды вясной яшчэ дні невялічкія, што рабіў і як было зраньня, пад вечар і забыцца можна, а там пуд, як дарма: засявай сваю палоску і пяі сабе песьні. Але гэтак засеіў палоску той, хто меў канінку. А большасьць, якая чакала „парадку“, так і засталася бяз нічога. Бо сеіць было ўжо пазнавата, грошай заплаціць, у некаторых было малавата, а ў некаторых і зусім ня было, дык і ад запісанага пудзіка мусілі адмовіцца.

Стаў ужо наш селянін памаленьку прызабывацца аб веснавым збожжы, аб раздачы, аб рэфэрэнту, але аб ім, дык неяк не забыліся. Бо яшчэ нядаўна прыходзіць прыказ да сялян даплаціць грошы за збожжа, хто так, ці гэтак, дастаў вясной на насеньне. Думалі сяляне, думалі, гадалі, гадалі, каб знайсьці прычыну, якая заставіла ўладу давыбраць з іх грошы за збожжа, але нічога не маглі прыдумаць. Толькі некаторыя, скарэйшыя на дагадку, гаварылі: „Гэта пэўне ў рэфэрэнта масла растапілася ад цяплаты, ці ячкі папсуліся, што браў ад сялян гасьцінца, а можа й шашок курачкі падушыў, бо й гэта няшчасьце, у нашым краі, часта здараецца.

На гэтым можа ўжо й скончацца ў сялян успаміны аб збожжы.

Я. Квяткоўскі.

Аб аўтакефальнасьці Праваслаўнай Царквы.

(З журн. „Przegląd Wileński“).

Пасьля ўтварэньня на руінах б. Расейскай Імпэрыі новых гаспадарстваў, жыхары якіх належаць, у большым ці меншым ліку, да праваслаўнага веравызнаньня, пытаньне аб арганізацыі Праваслаўнае Царквы ёсьць нязвычайна пільным і вымагаючым шыбкага разьвязаньня.

Асабліва-ж пільным ёсьць гэтае пытаньне для земляў беларускіх, жыхары якіх у значнай часьціне праваслаўнага веравызнаньня.

Праваслаўная Царква ужо ў пачатку свайго істнаваньня, з III века, пачынае дзяліцца на царкоўныя правінцыі, зусім адна ад аднэй незалежныя ў царкоўным устроі і-кіраўніцтве. На чале гэтых правінцый сталі звычайна-япіскапы галоўных местаў (мітрапаліты), а пачынаючы з V века ў правінцыях болей значных — патрыярхі. Праваслаўная Царква з гэтага якраз часу усьцяж да нашых дзён была ў шчыльных суадносінах з гаспадарственым строем, а знамяніты расейскі каналіст, Міхаіл Гарчакоў, сьцьвярджае, што Праваслаўная Царква прызнавала і прызнае гаспадарственае законадаўства крыніцаю ў вобласьці устроя і кіраўніцтва царкоўнага і прытым крыніцаю раўнаважнаю з другімі крыніцамі кананічнага права, за выключэньнем толькі пытаньняў дагматычных. Беспасрэднім пасьледзтвам вышэй паказанага становішча ёсьць гістарычны факт паўстаньня і ўпадку аўтакефальных цэркваў у зьвязку з іх гаспадарственай прыналежнасьцю.

З ліку 14 істнуючых цяпер аўтакефальных цэркваў шэсьць знаходзяцца ў Турэцкіх землях і захавалі спрадвеку істнуючыя патрыярхаты і япіскопіі. Усе іншыя утварыліся пераважна ў мамэнт вызваленьня ад турэцкай няволі. Так, Сэрбская Царква, аўтакефальная з часу цара Стафана Душана ў 1346 г., страціла сваю самастойнасьць з упадкам незалежнасьці Сэрбіі пасьля бою на Косавым полі ў 1389 г. і вярнула яе сабе пасьля вызваленьня Сэрбіі, у 1883 г. Баўгарская Царква была аўтакефальнай з IX сталецьця пры незалежных князёх. пасьля 1394 году далучана Туркамі да Канстантынопальскага патрыярхату, вярнула сабе права ў 1878 г. з мамэнту абвешчаньня самастойнага княжства, таксама як і ў Грэцыі, пасьля здабыцьця ёю незалежнасьці, стварылася ў 1828 г. аўтакефальная Элядзкая Царква.

Найбольш яскравы прыклад дае устрой Праваслаўнае Царквы ў Аўстра-Угорскай манархіі: там побач істнаваўшай з XVII в. ў Угоршчыне аўтакефальнай Карлавіцкай Царквы (для сэрбаў) істнавала ў аўстрыйскай палавіне манархіі таксама аўтакефальная Чарнавіцкая Царква, а з часу акупацыі Аўстра-Угоршчынай Босьніі і Гэрцагавіны ў 1878 г. Босьнійская Царква зрабілася фактычна незалежнаю, маючы толькі знак залежнасьці ад Канстантынопаля ў зацьверджаньні патрыярхам назначанага імпэратарам мітрапаліта.

Тое самае бачым у Літве і Літоўскай Русі. Ужо пачынаючы з XI веку Кіеўская мітраполія вызваляецца з-пад улады Канстантынопальскага патрыярха; калі-ж Кіеўская Русь падпала пад уладу В. Князёў Літоўскіх, а Кіеўскія мітрапаліты, пачынаючы з Максіма Грэка, пераехалі спачатку ў Валадзімір над Клязьмаю, а далы ў Маскву, прыйшла патрэба стварэньня аўтакефальнай Літоўска Рускай Царквы; урэшце ў 1412 г. літоўска-рускае духавенства на згуканым па загаду В. Кн. Вітаўта сабору у Наваградку абрала мітрапалітам ігумена Грыгора Цамблака, пры жыцьці Маскоўскага Фоція; абраны быў кананічна рукапаложан, нягледзячы на супроцьдзеяньне патрыярха. Пасьля пераходу мітрапалітаў на унію, для астаўшых вернымі Праваслаўнай Царкве ўстаноўлена за каралём Валадзіславама IV у 1633 г. Магілеўская япіскопія, а пасьля заняцьця Літвы Расеяй скасавалася самастойнасьць Літоўска Рускай Царквы.

Вялікая сусьветная вайна зрабіла ў краёх з праваслаўнымі жыхарамі вялікія палітычныя перамены, каторыя павінны, бяз сумніву, адбіцца на ўстроі Праваслаўнае Царквы. Бо водле агульных асноў кананічнага права Праваслаўнае Царквы, у кожным краі, у якім па умовах палітычных, гістарычных ці геаграфічных жыхары маюць магчымасьць і спосаб стварыць самастойнае сацыяльнае жыцьцё,—жыхарам гэтым належыць права стварэньня аўтакефальнае царквы. Дык, з аднаго боку, дзеля гаспадарственага злучэньня, адбудзецца злучэньне цэркваў дагэтуль аўтакефальных — Сэрбскай з Карлавіцкай і Чарнагорскай, Румынскай з Чарнавіцкай, Элядзкай з Кіпрскай, — у вадзіныя нацыянальныя цэрквы. З другога боку будуць адбудованы аўтакефальныя цэрквы: Украінска-Кіеўская і Літоўска-Беларуская.

Каналісты Праваслаўнае Цэрквы прызнаюць чатыры ўмовы, патрэбныя для стварэньня аўтакефальнай царквы: 1) воля жыхароў творанай аўтакефальнай царквы; 2) згода ўраду той царквы з якой выдзяляецца новая; 3) прызнаньне новай царквы другімі аўтакефальнымі царквамі; і 4) згода ўраду таго краю, у якім ствараецца новая царква.

Як бачым, аднак, з гістарычных прыкладаў, галоўнай сілаю стварэньня аўтакефальнай царквы была заўсёды воля гаспадарственнай улады, абапёртая на выразна паказанай ці спадзяванай волі жыхароў. Згода іншых цэркваў прыходзіла гараздз пазней, — звычайна абходзілася бяз згоды дагэтуль істнуючай царквы і навет абвешчаньне аўтакефальнасьці мела месца наўпрэкі выразна выказанай волі гэтае царквы.

Так было ў Царкве Баўгарскай, каторая была абвешчана аўтакефальнай на уснове султанскага фірмана 1862 г., ня гледзячы на тое, што патрыярх на Царградзкім Саборы абвесьціў гэтую царкву схізматычнай і налажыў анафему на Баўгарскіх валадыкаў. Карлавіцкая Царква створана адно толькі на ўснове дагавору імпэратара Леапольда I з месным Царкоўна-Народным Саборам а Элінская Царква была прызнана патрыярхам толькі цераз 24 гады пасля абвешчаньня яе аўтакефальнасьці Нацыянальным Зборам. Таксама Царква Руска-Кіеўская і Вітаўтава Царква Літоўска-Руская зрабілі аўтакефальнымі ня гледзячы на супраціўак патрыярха.

Належыць, значыцца, прызнаць, што на землях, выйшаўшых з пад расейскага панаваньня, істнуюць усе ўмовы для стварэньня, ці правільней—адбудовы аўтакефальнай царквы. Для гэтага трэба толькі, як гэта мела месца ў Угоршчыне ў 1690 г., каб з пачыну урадуючай улады быў скліканы царкоўна-народны збор і каб гэтая ўлада зацьвердзіла апрацаваны зборам арганічны Статут аўтакефальнай царквы.

Што датыча царкоўнага ўстрою, дык найболей адпаведнай месным умовам і пануючаму цяпер дэмакратызму была б царкоўна-народная арганізацыя, як у Царкве Карлавіцкай, у якой галавою царквы ёсьць мітрапаліт, заканадаўчая ўлада належыць Царкоўна-Народнаму Сабору, складзенаму з валадык і з абраных прыходамі прадстаўнікоў, з каторых ⅓ з духавенства, а ⅔ з міранаў; улада споўняючая належыць абранай Саборам Царкоўна-Народнай Радзе, а ўлада дагматычная — Сіноду валадык.

З той прычыны, што землі, на якіх жыве беларускі народ, уваходзяць, апроч Сярэдняе Літвы, у склад чатырох гаспадарстваў: Польшчы, Савецкай Беларусі і часткаю Літвы і Латвіі (Пятым гаспадарствам ёсьць Маскоўшчына, да якой далучана амаль не палавіна этнаграфічнай Беларусі — Рэд.), — дык у цяперашні час трудна ажыцьцёвіць стварэньне адзінай аўтакефальнай Беларускай Царквы. Дзеля гэтага выпадае, па згодзе з меснымі ўрадуючымі ўладамі і патрыярхам Маскоўскім, распачаць стварэньне месных незалежных цэркваў.

Гэта ня будзе супярэчыць нацыянальным імкненьням беларусаў, бо калі спраўдзіцца іх заветная думка і прыдзе незалежная Беларусь, дык ня будзе зусім перашкод злучэньню, па прыкладу чатырох сэрбскіх цэркваў, усіх месных цэркваў у вадзіную аўтакефальную Беларускую Царкву.

Т. Вороніч.

АД РЕДАКЦЫІ. Лічым патрэбным паказаць пры гэтым на поўную безасноўнасьць закідаў, якія робяцца некаторымі польскімі газэтамі праваслаўнаму духавенству, а за што: газэты гэтыя абураюцца, што для кіраваньня часьцінаю Менскай эпархіі, далучанай да Польшчы, назначан духоўнаю ўладаю, якая знаходзіцца за межамі сучаснай Польшчы, япіскап Панталеймон. Тым часам духоўная ўлада зрабіла зусім правільна: дзеля таго што валадыка Менскі Мельхіседэк перабывае за граніцаю Польшчы, дык у прыпадку неназначэньня асобнага япіскапа, часьціна эпархіі засталась-бы без япіскапскага кіраўніцтва. Прыпомнім, што гэтак заўсёды было і ў каталіцкіх эпархіях. Так, напрыклад, калі па Венскаму трактату часьціна Кракаўскай эпархіі адыйшла да Расеі, дык ёю кіравалі асобныя вікарныя біскупы ўсьцяж да 1883 г., калі была створана асобная Келецкая эпархія. Цяпер ізноў, калі часьціна Сьлезіі адыйшла да Польшчы, для кіраўніцтва гэтай часьцінаю эпархіі біскуп Браслаўльскі (прытым вораг Польшчы) назначыў асобнага вікарнага біскупа. Такім чынам пратэсты супроць япіскапа Панталеймана безасноўны, а таксама незаконна недапушчэньне загадываць парахвіямі назначаных гэтым япіскапам настаяцеляў.

Роўным чынам зусім незаконна вымаганьне, каб мятрычныя кнігі праваслаўных парахвіяў пісаліся папольску. Прыпомнім, што замена польскага і лацінскага тэкста каталіцкіх мятрычных кніг правільна лічылася палякамі дзікім насільствам, а нядаўна інфулат кс. Міхалькевіч рашуча адкінуў вымаганьне нямецкай ўлады, каб мятрычныя кнігі пісаліся панямецку, і прадпісаў духавенству пісаць іх на рытуальнай лацінскай мове, за што і быў высłан з Вільні. Дык адзіна правільным было-б вымаганьне каб запісі рабіліся ў праваслаўных беларускіх парахвіях ці на прыроднай меснай мове, г.-ё. па беларуску, ці на мове літургічнай, значыцца, пацаркоўна-славянску, — таксама як у беларускіх каталіцкіх парахвіях—пабеларуску ці палацінску.

АГЛЯД ДРУКУ

Што піша „Jednaść“

У № 26 польска беларускай панскай газэты „Jednaść“ зьмешчан такі артыкул:

„Савецкі ўрад праз увесь час абвінавачваў палякаў, быццам то яны прычынай таго, што народ беларускі, раз за разам паўстае процеў бальшавікоў.

Няма чаго і гаварыць, што гэта толькі бальшавіцкая брахня, бо ніякай і нічыей падмовы ня трэба: народ беларускі сам добра разьбіраецца і разумее, што слаўная задача — гэта скінуць зненавіджаныя бальшавіцка-камуністычныя парадкі, а завесьці свае ўласныя.

Бальшавікі паўстанцаў ахрысьцілі „бандытамі“, а каб і сапраўды справакаваць паўстанцаў і накінуць на іх дрэнную славу, камуністы арганізавалі свае — ужо праўдзівыя банды на тэрыторыі паветаў Нясьвіжскага, Сталпецкага, Баранавіцкага, Лунінецкага і інш. — і назвалі іх „баявікамі“.

Адначасна з працаю агентаў — баявікоў бальшавіцкіх, у гэтых паветах распачалася работа і агентаў — так званага ўраду Ластоўскага, якія пачалі арганізаваць свае „баявыя тройкі“.

На арганізацыю гэтых „троек“ былі атрыманы пеўныя сумы грошаў з Коўны і разасланы верныя агенты.

Так — два месяцы таму назад да Нясьвіжа і Клецка быў высланы агент Д..., якога паліцыя была нат, злавіла, але пасьля чамусь то выпусьціла яго. У Лунінец пасланы быў агент у лапцёх— М..., а ўрэшце — на Палесі зьявіўся і сам гэнэральны камісар Ж...

Як прававалі „таварышчы-баявікі“ і „баявыя тройкі“ і якія туды назьбіраліся — відаць тыпы ужо з таго, што першым чынам пачалі яны паліць двары, грабіць сялібы, а то і проста рабаваць усіх, хто пападзецца пад руку.

У Сіняўскай воласьці спалена некалькі гумнаў з неабмалочаным яшчэ зернем; так сама пажары былі і ў іншы валасьцёх, гдзе так сама главным чынам палілі поўныя скапоў гумны.

У Сноўскай воласьці так сама шмат спалілі і аграбілі хутароў, Калі за адным такім майстрам сяляне пагналіся, каб злавіць яго, той — уцякаючы — стаў крычаць: „таварышы—левыя эсэры — ўсе да мяне!“

Зд раецца, што „баявікі“ выяўляюць і сваю ганорнасьць.

Было некалькі выпадкаў грабежства купцоў па дарозе з Баранавіч да Клецка і—калі гэткі раз ўжо абрабаваны купец пападаўся ў рукі „баявікоў“ други раз, — то яго пушчалі, кажучы: „з гэтага ўжо на арганізацыю ўзята.»

Правакатарскім спосабам „баявікі“ забілі лепшых партызанаў: Гэлака, паручніка П. Бранавіцкага і інш., а так сама Гаўрыловіча і др., ужо перайшоўшых на польскую тэрыторыю.

Як бы не стараліся гэтыя „баявікі“, — усё роўна на іх вудачкі народ беларускі ня пойдзе. Да сябе ім удалося заманіць толькі кучку зладзеяў — прафэсыяналаў і народ знае — хто цягне яго ў бяздонную пропасьць. Янка Макранскі“.

Пралескі.

Зямелька-маць радзіла іх
Ад першых пацалункаў сонца!
Між зёлак леташніх сухіх
У бары ўзышлі яны ў старонцы.
Шумяць што-разу вясялей
Над імі хвоі аб прадвесьні,
І вецер што-дня ласкавей
Іх песьціць і пяе ім песьні.
І хоць зімы відны сьляды,
Яшчэ марозіць часам ночкай,
Ды больш ня страшаць халады,
І верыш мілым сінім вочкам;
І любы так бясконца мне
Яны, з усьмешкай ціхай дзеці!..
Пара іх, кволых, праміне,
Прайдуць яны, як ўсё-на сьвеці.
Але ўжо мкне душа мая
У сінюю даль за пералескі,
І ўсходзяць ў сэрцы—чую я—
Тугі вясьнянае пралескі.

1921. Валадзімір Жылка

Зязюля і Варона.

Вясной Зязюля прыляцела
І ў зялёным гаю села,
Села сабе на суку
І зачала сваё: „Ку-ку, ку-ку“...
Варона там гнязло рабіла
І так да яе загаманіла:
„Чаму, Зязюля, не працуеш,
Толькі цягам ўсё кукуеш?
Досыць кукаваць так бязупынку
Перастала-б хоць гадзінку,—
Рабіць гняздо мне прашкаджаеш“.
„Эх, Варона ты дурная!
Ці-ж ты гэтага ня знаеш:
Мужык рабіць увеў моду,
А я дык з панскага вядуся роду;
Ніхто з нас рабіць гнязда ня знае,
І ня кормім мы дзяцей.—
Гняздо за нас ім зробіць хам
І дзяцей пракорміць нам“.
І вот-жа ей
Так Варона адказала:
„Хоць разуму я маю мала,
Аднак-жа, мне, дурной, здаецца,
Што ў нас парадак завядзецца,
Справядлівы будзе ўсім закон,
І што паноў такіх пагоняць вон“.

Янка Быліна.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

М. Хаценчыцы Вялейскага пав.

Злавілі зайца і куюць, куюць
і кажуць, што ён вярблюд.
Заяц крычыць: „Братцы, што
робіце, я-ж не вярблюд
Людцы, родныя, ратуйце!“
(Народная прыказка.)

Па загаду Статыстычнага Ураду Рэчыпаспалітай з 30 верасьня па 1 кастрычніка павінна была адбыцца аднадзённая перапісь, але дзякуючы недахватку тэхнічных працаўнікоў, перапісь гэта працягнулася 4—5 дзён, але гэта нічога, ня ўгэтым пакрыўдзілі нас беларусаў — пакрыўдзілі тым, што карыстаючы з нашае несьвядомасьці і няўменьня чытаць папольску, гэтыя п. камісары — перапісчыкі пісалі так, як ім падабалася. Напрыклад, у Чарвякоўскім абводзе быў камісарам нейкі пан Зароўскі, лоўны маёнтку Чарвякоў, які так старанна пісаў, што амаль ня ўсіх беларусаў, хоць на паперы, але зрабіў палякамі, можна відзець з таго што п. Зароўскі перапісаўшы болей як 600 душ, запісаў беларусамі ўсяго каля сотні, а рэшта палякамі, а трэба было напісаць паадварот.

Калі гэтак старанна пісалі ўсе камісары, дык можна спадзявацца, што вялікая лічба зьявіцца новых палякоў, якія усё-ж такі, як лічылі сябе беларусамі, так і лічуць. А вы, панове—камісары, можаце пісаць, калі вам можна перарабляць на паперы беларусаў на палякоў, але ў глыбіні нашых сэрцаў перарабіць нас вам не ўдасцца.

Тутэйшы.

М. Вязынь Вялейскага павету.

Інспэктар Падатку Скарбовага ў Вялейцы нядзелі дзьве таму назад прыслаў у нашу воласьць бланкі пратаколаў. „Zeznań o majątku do wymiaru podatku majątkowego na okres 1921, 1922, 1923.“ друкаваных папольску, а воласьць раздала іх кожнаму жыхару, каб запоўніць усе пытаньні, ўзяўшы данныя з гаспадаркі. Аб тэрміне, у які гэтыя пратаколы павінны былі здасланы Інспэктару. Інспэктар не назначыў. Воласьць раздала іх жыхарам і такжа нічога ім не абьясьніла, для чаго яны раздаюцца і што з імі трэба рабіць. Жыхары нашы папольску ні чытаць ні пісаць ня ўмеюць, і што рабіць з гэтай паперай ня сьцямілі. Прайшло дзён 4—5 і ў воласьці атрымана абвяшчэньне ад таго-ж Інспэктара і для раздачы тым жа жыхарам, што яны за „nie złożenie zeznań o majątku,“ аштрахованы на 500 марак кожны, а бланкі гэтых пратаколаў ня розданы яшчэ й цяпер. Другі жыхар і ня ведае, за што ён аштрахован, бо гэтай жа бланкі не атрымаў саўсім, а другі атрымаў, запоўніў і аддаў у воласьць і усё роўна аштрахован.

Жыхар.

Веска Вялікая Ліпа Нясьвіскага павету, Сноўскае воласьці.

18-кастрычніка ў нашай школе пачаліся заняткі на выкладовай беларускай мове. Адразу запісалася 100 дзяцей (трэба спадзявацца й болей) Ахвотна дзеці купляюць беларускія ксёнжкі і ахвотна чытаюць пабеларуску і папольску. Школьныя падручнікі бязмала ўсе маюць. Няхват яшчэ крыху практычных правапісаў і ксёнжак па рэлігіі, але неўзабаве і гэта будзе.

Добра было-б мець падручнікі для пачатковых школ па геаграфіі і гісторыі.

Заняткі з ведама павятовага інспэктара вялуцца ў дзьве зьмены, бо бракуе лавак і другі пакой яшчэ не агледжаны, але і гэта мабыць скора наладзіцца, тады будзе другая сіла. Добра было-б, каб далі настаўніка, каторы мог-бы добра сьпяваць і кіраваць сьпевамі. Працуе ў школе 3-і год стары настаўнік-беларус.

Кажуць, што наш п. інспэктар гладзіць прыхільна на беларускую справу, адно прызіраецца, каб школа не цягнула ў бок Масквы (ня ведаю, як Варшавы?) а школ беларускіх не адчыняе, бо няма адпаведных беларускіх настаўнікоў. (?!—Рэд.) Можа ў гэтым і праўда.

Г...кі.

М. Крынкі Горадзенскага пав.

Тэатральнай сэкцыяй нашага Гуртка Моладзі, у нядзелю 30 га кастрычніка, была пастаўлена камэдыя Родзевіча «Зьблытэжаны Саўка». Пастаноўшчыкам і рэжысёрам быў п. Пералайка (псаломшчык нашае цэркви). У ролі Саўкі непараўнавана іграў п. Астроўскі Рыгор. Дзякуючы таленту п. Астроўскага, камэдыя мела вялікую папулярнасьць сярод слухачоў. Аплёдысмэнтаў было дужа многа. Задавальняюча гуляла і панна Анісімовічанка Ксеня ў ролі Магрэты. Адным яе недахватам было тое, што гледзячы на сьмешную фігуру Саўкі, некалькі разоў усьміхнулася. Роль Жабрака гуляў п. Лотыш Янка даволі добра. Асабліва яму ўдаўся грым і вопратка. Наагул камэдыя прайшла вельмі добра. Па заканчэньні камэдыі раздаўся цэлы гром аплёдысмэнтаў з бясконцымі крыкамі «брава».

С.—Д.

М. Даўгінава. Школа. У нас ёсьць добрая навіна. Адчыняюць чатырохклясовую школу. Ужо ёсьць абвесткі: каб прывадзілі дзяцей запісавацца на паступленьне ў школу. Гэта радасьць, вялікая радасьць.

Няшчаснае здарэньне. 26-га кастрычніка ў Адама Ягелы невядома адкуль знайшлася ручная граната. Калісь-то ў яго жылі салдаты, мусіць яны пакінулі недзе. Ен кажа што ён у полі знайшоў. Тым часам, знайшоўшы бомбу і ня ведаючы, што яна ёсьцека за рэч, ён кінуў яе у печ, павыбівала вокны ў хаце і парапіла твар 80 гадоваму Адаму Ягеле.

Пажары. 26 кастрычніка ў вёскі Авошкі вечарам, невядома з чаго, загарэлась гумно і разам згарэлі аж тры гумны. Шмат згарэла добра, збожжа і сена, страты вялікія. Шкода вёскі: ніякі агонь яе ня мінае, — што вайна, што бяда,—усё наша вёска церпіць.

Напад бандытаў. 27 кастрычніка ўночы напалі зладзея на вядомага ў Даўгінаве купца М. Шапіру. Зайшоўшы у хату з леварверамі ў руках, папрасілі грошы. Пастрашыўшы выстраламі, забралі грошы каракулевыя хутры і многа дарагацэнных рэчаў. Выстралілі два разы і ўцяклі невядома куды.

Вульф Сосенскі.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

Два пагляды на кааперацыю.

Як вядома, паўстала думка аб патрэбе злучэньня усіх Саюзаў Спажывецкіх Таварystваў у вадзін. Пакуль што найбольш гавораць аб злучэньні двух Саюзаў, гэта Віленскага Саюза Кааперетываў, які называюць „Беларускім“ і „Związku Ziemi Wileńskiej“, які празываюць „польскім“. Для злучэньня Саюзаў патрэбна апрацаваць статут, па якім бы сайшліся ўсе Саюзы ў асобах іх Управ, Рад і зьездаў Паўнамоцнікаў. І вось якія асновы будучага Саюзу высуваюць абедзьве стараны:

Саюз „Земі Віленскай“ прапануе Літве Сьродковай, каб Урад у Статуце новага Саюзу зацьвердзіў правы і абавязкі Рады Саюзу з тым, каб пасьля толькі Урад і мог зьмяніць. Віленскі Саюз Кааператываў дамагаецца, каб правы і абавязкі для Рады каапэратыўнага Саюзу устанаўляваліся рэгулямі кожны раз на зьезьдзе паўнамоцнікаў Саюзу, (самых каапэратараў, як гэта ёсьць і цяпер у гэтым Саюзе.

Далей Саюз „Земі Віленскай“ хочаць, каб Управа новага Саюзу выбіралася-б толькі з тых кандыдатаў, якія прапануе Рада Саюзу, а Віленскі Саюз Кааператываў стаіць на тым грунце, што паўнамоцнікі ад каапэратываў на сваім зьезьдзе выбіраюць Управу Саюзу з тых кандыдатаў, якія сам зьезд высоўвае, незалежна ад таго, ці хо-

чаць іх Рада Саюзу ці не. Тут трэба дадаць, што „Саюз Земі Віленскай“ наогул стаіць на тым грунце, што Управа Саюзу павінна быць як найменшая, а магчыма пераход і саўсім на так званы „Дырэктарыят.“ у якім выпадку „Дырэктары“ Саюзу найімаюцца па кантракту Радай, зьезд-жа паўнамоцнікаў Саюзу тады толькі дае згоду на запрашэньне тагоці іншага „Дырэктара“ і Дырэктары залежаць ад Рады. Дырэктарыят збоку „Віленскага Саюзу“ ня маець прыхільнасьці.

Найважнейшая-ж расхадзімасьць вось на якім пункце: „Саюз Земі Віленскай“ стаіць на тым становішчы, што паўнамоцнікі у Саюз павінны выбірацца аб'ядзінёным паседжаньнем Рады з Управай, а гдзе няма Рады—там Управай з Рэвізыйнай Камісіяй. Такім парадкам, каб быць выбраваму паўнамоцнікам ад таварыства трэба быць ці сябрам Управы ці Рэвізыйнай Камісіі і гэтым устанаўліваецца двусьцяпеннасць выбараў. Віленскі-жа Саюз Каапэратываў стаіць на тым грунце, што выбары павінны быць аднасьцяпенныя, гэта значыцца, што паўнамоцнікі павінны выбірацца на агульным сходзе таварыства усімі сябрамі таварыства проста ў Саюз, а не праз свае Рады, Рэвізыйныя камісіі і Управы

Цікавая прапазыцыя „Саюзу Земі Віленскай“ яшчэ і вось якая: ўсе каапэратывы ў негандлёвай дзейнасьці дзеляцца на нацыянальныя і іншыя сэкцыі, а ўвесь негандлёвы, а ў тым ліку і арганізацыйны аддзел яўляецца аўтаномным ад Управы. Віленскі Саюз Каапэратываў стаіць таксама і па гэтаму пытаньню на іншым становішчы, а іменна: у каапэрацыі няможна дзяліцца па партыях, нацыянальнасьцях і так далей; каапэратары аб'ядноўваюцца ідэямі каапэрацыі незалежна ад таго, якой яны партыі, нацыянальнасьці, рэлігіі і г. д., і дзеля гэтага ня варта паміж каапэратарамі гарадзіць плот.

Станіслаў Чыжэўскі.

6. XI. 1921 Вільня.

ХРОНІКА

◆ У рэдакцыю „Бел. Вед.“ прыйшоў па пошце №3 беларускага журнала „Сялянскія Доля“. Журнал выдаецца Сувязью Беларускага Працоўнага Сялянства; дзе—не паказана. №3 мае 31 стр. і зьмяшчае ў сабе палітычныя і эканамічныя артыкулы, вершы, агітацыйныя прыказкі і заклікі. Лёзунг „Сялянскай Долі“ — незалежная і непадзельная Беларуская Рэспубліка: «Калі хто-небудзь табе скажа, што Беларусь — гэта ёсьць „Северо Западны Край Расеі“, ці-то „Ісконі Руская Зямля“ або “Усходнія Красы Польшчы“— ня слухай яго, бо ён стаіць за тыя парадкі, якія даўно ўжо абрыдлі нашаму народу — ён стаіць за прывярненьне мінулых часоў гнёту, зьдзеку і паняволеньня, а дзеля гэтага — ён вораг твой і ты павінен з ім бароцца». Трэба прызнаць, што „Сялянскую Долю“ пішуць людзі здольныя і энэргічныя.

◆ Ад Случакоў атрымана на газэту „Беларускія Ведамасьці“ 600 м. ахвяры праз грам. Рогача, за што газэта шчыра дзякуе.

◆ У Вільні ў доме № 8 па Міцкевічавай вул. (быўшы Георгіеўскі просп.) пачала працаваць камісія па рэестрацыі стратаў ад сусьветнай і польска-савецкай войнаў. Там-жа прымаюцца заявы аб звароце вывезеных ўРасею і Украіну маемасьця.

Пры падаваньні просьбаў трэба далучаць адпаведныя дакумэнты—пасьведчаньні, што даная асоба мела страту і шкоду.

◆ „Віл. Утро“ ў № 41 ад 21 лістапада паведамляе ў заметцы пад назовам перамены: „Па вестках прыйшоўшых з Варшавы, пасьля таго, як п. Майштовіч пачне спаўняць свае абавязкі (Старшыні Часов. Урадуючай Каміс. Сярэд. Літвы—Рэд.) адбудзецца чарада зьмен сярод дырэктараў дэпартамэнтаў і іншых вышэйшых асоб. Мае быць увахад у склад прадстаўнікоў беларусаў і жыдоў, а таксама сяброў Польскай Партыі Сацыялістычнай. Запрапавана будзе таксама і ліцьвінам дэлегаваць свайго прадстаўніка на важную пасаду.

◆ У № 60 панядзелкавай газэты „Nowiny Vilenskie“ перадрукован артыкул „А дзе-ж Сойм“ —М. К. з № 10 „Беларускіх Ведамасьцей“,

◆ У панядзелак 21 лістапада выйшаў першы нумар новай нацыяналістычнай польскай газэты „Wileński Kurjer Poświąteczny“ Газэта заяўляе, што мае на мэце „мецна стаяць на старане польскай гаспадарсьці[illegible]... у краі, не далучаным да Польшчы! Цікаўна што на гэта скажа ўлада Сярэдняй Літвы?

◆ Польская газэта „N. Dziennik Białostocki“ (№ 40) паведамлае, што ў Сакольскім павеце школьная асьвета стаіць вельмі нізка. Бракуе школ, а яшчэ болей бракуе вучыцельскіх сіл. Вучыцялёў ёсьць 136, большасьць невыкваліфікаваных. Школ 90, з іх толькі 10 месьцяцца ў сьпецыяльных школьных будынках, а рэшта ў хатах, зусім неадпавядаючых школьным патрэбам. У многіх школах перарваны заняткі, бо няма дроў. Навуковых падмог поўная няхватка. Сярод вучыцялёў (польскіх, разумеецца — Рэд. „Бел. Вед.“) часта спатыкаюцца людзі, якія ня ўмеюць гаварыць па польску або гавораць такой польскай мовай, што проста скура шорхне“.

Курсаў для дарослых няма нідзе.

◆ Выпушчан пад заклад з Лукішскай турмы пасьля сямёх-месячнай няволі рэдактар газэты „Pochodnia“ грам. Мацейковіч.

Рэдактар жыдоўскай работніцкай газэты грам. Шавель яшчэ сядзіць у турме („В. У.“).

◆ У газэце „Jedność“, якая зьяўляецца, як вядома, органам створанай п. Аляксюком польска беларускай арганізацыі „Związek Krajowy“, надрукован для ашуканьня малых хіба дзяцей такі „Ліст у Рэдакцыю“:

„Паважаны грамадзянін рэдактар! Не адмоўцеся, калі ласка, надрукаваць у Вашай газэце „Jednaść“ ніжэй пісанае: Я дастаю акуратна ўсе беларускія газэты, каторыя выдаюцца ў Вільні і вось, чытаючы іх, заўважыў, што паміж беларускімі дзеячамі вядзецца нейкая сварка. Я, як селянін глухой вёскі, не магу стрымацца, каб ня выказаць таго, які погляд сялян на тыя і другія беларускія арганізацыі. Так газэта „Jednaść“ ідзе паводлуг нас, па самай праўдзівай дарозе, вядучы да супольнай з палякамі адбудовы краю. На чале гэтай арганізацыі стаіць добра вядомы сярод сялян паважаны п. П. Аляксюк. Гэта асоба нам добра вядомая, як шчыры працаўнік на Ніве Бацькаўшчыны з маленства. Цяпер чытаючы „Беларускі Звон, Krynica і Беларускія Ведамасьці“ становіцца вельмі прыкра, што на галаву п. Аляксюка выліваюцца незаслужана памыі. Такім чынам можна зразумець, што так званыя працаўнікі—дзеячы народныя, якія выліваюць рожны бруд на п. Аляксюка, быццам апіраючыся на сялян, зьяўляюцца ня больш ня меньш, як людзьмі часу, каторыя цяпер едуць на чырвоных жарабцох Маскоўскіх і Ковенскіх. Цікава, з якое рацыі яны апіраюцца на народ, калі народ іх ня ведае, бо яны народу за ўвесь час нічагусенька не далі і даць ня могуць. Ды што-ж яны дадуць, калі яны толькі заняты песьнямі для тых, на чыіх вазох едуць.

Так што, мае паночкі, абаронцы беларускае справы, пішучыя Звон і Ведамасьці, Вам парасайсьці са сцэны, Вы сваё аджылі, бо Вы хоцьзаўсёды апіраецеся на народ, але народ лічыць Вас людзьмі паміж іншым. Я як селянін, вельмі пакрыўджаны за тое, што ў газэце «Беларускія Ведамасьці» часта называюць тых, хто трошкі інакшэй думае, як яны беларусамі праз літару „ѣ“. Гэта крыўда ўсім сялянам, бо мы-ж жыхары беларускае вёскі з прадвеку, кроўныя беларусы, а Ведамасьці называюць нас «тоже беларусамі», мусіць мераюць на свой аршын. Бывайце здаровы Выбачайце, што кепска напісаў, але даруйце, старасьць, 61 гадок, галава не працуе, як належыць. З пашанаю Максім Перапечка. З вёскі Слабада, Бакштанскае воласьці, Валожынскага павету.“

Цікаўна, з якой-жа сцэны пара сайсьці нам? Калі са сцэны польска-беларускага паразуменьня і арганізацыі беларускай грамадзкай работы на беларускіх землях пад Польшчаю, дык-жа п. Аляксюк узяў манаполію на гэтую сцэну і разам з ворагамі беларускага народу ня пускаець на яе навет паважных беларускіх дзеячаў паланафілаў. Але вось бяда, што ён з волі ці з няволі нічога добрага для беларусаў ня робіць на гэтай сцэне, а калі што й робіць, для паказу, дык якраз, можа, затое, што «Беларускія Ведамасьці» вытыкаюць яму дзяньгубства. Няўжо-ж відная для ўсіх і карысная для грамадзянства паважная праца патрабавала-бы для сваёй атэстацыі такіх мізэрных «Лістоў у Рэдакцыю»? Дарма! Лямант аб «памыях» і „чырвоных жарабцох“ пустога месца не запоўніць і нікога не ашукае.

Агульнік.

Усім сябром Таварыства Беларускай Школы, беларускім вучыцялём, дзеячам, прыхільнікам справы беларускае асьветы.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада зьвяртаецца да Вас з просьбай падаць дэтальныя ведамасьці аб існуючых у Вас беларускіх школах, прытулках, таварыствах і іншых асьветных установах, а асабліва прысылаць ведамасьці, дзе былі беларускія пачатковыя школы, дзе патрэбна адкрыцьце беларускіх пачатковых і сярэдніх школ і заявы і пастановы ў гэтай справе. Дзеля таго, што бяз успомняных даных Беларускай Цэнтральнай Школьнай Радзе цяжка апрацаваць бюджэт, справа гэтая ёсьць неадкладнай, і просіцца прысылаць ведамасьці як мага хутчэй па адрэсу:

м. Вільня, Віленская вул. дом № 12. Канцылярыя Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады.

Старшыня: А. Смоліч.
Сэкрэтар: І. Краскоўскі.

8 лістапада 1921 г.
м. Вільня.

Курс на грошы у Вільні.

23 лістапада.

Царскія (100)	380
Ням. маркі (1000)	15
Осты (1000)	14
Даляры	3650

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзе больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісываццa, бо ад гэтага залежыць далейшае жыцьцё «Беларускіх Ведамасьцей». Хто ня ўмее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Браты, прыміце блізка да сэрца ўсе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб «Беларускія Ведамасьці» ў вашым раёне выпісываліся і пашыраліся.

Хай жывець народная справа!

Адрас: Wilno, Ostrobramska № 9, „Беларускія Ведамасьці“.

Беларускі паказальнік:

Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт-Вострабрамская вул. № 9.
У тым-жа будынку: Гімназія, Прытулак і інш. установы
Віленскі Беларускі Музык.-Драматыч. Гурток—Біскупская в. № 12-6.
Беларускае Выдавецкае Таварыства — Вільня, Віленская вул. д. 33, кв. 1 (ад 4-5 гадзіны)
Беларускі Каапэратыў „Райніца“ Вільня, Вялікая Пагулянка, 17.
Віленскі Саюз Каапэратываў—Вільня, Малая Пагулянка, 12.
друкарня „Друк“ — Вільня, Субач, 2
Рыскі аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“—Latwija, Riga, Nikołaj ulica 20 dz. 1.
Беларускае Культурна Прасьветнае т-ва „Бацькаўшчына“ у Латгаліі—Latwja, Riga, Witebskaja, 16.
Люцынскі Аддзел Беларускага Културна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“ у Латгаліі—Latwija, Ludze? Sjebeżskaja, 6.
Рады Беларускай Калёніі у Латвіі—Latwija, Riga, Bulw. Totlebena, 7-3.

Зьвяртаемся да ўсіх беларускіх арганізацый на сьвеце з просьбаю — прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.

Друкарня „ДРУК“, Субач 2.

Рэдактар Выдавец: Максім Гарэцкі.